УДК 655.11“1991/1995”(477)

**У. І. Кулiковiч**, кандыдат фiлалагiчных навук, дацэнт,
выконваючы абавязкi загадчыка кафедры РВТ (БДТУ);
**К. Т. Тарасевiч**, студэнтка (БДТУ)

# НАРМАТЫЎНА-ПРАВАВАЯ БАЗА УКРАIНЫ Ў СФЕРЫ КНIГАВЫДАННЯ (1991–1995)

Артыкул прысвечаны вывучэнню нарматыўна-прававой базы Украiны ў выдавецкай сферы першых гадоў дзяржаўнай незалежнасцi, калi фармiравалася сiстэма нацыянальна арыентаванага кнiгавыдання i кнiгараспаўсюджвання. Тут прадстаўлены ў храналагiчным парадку асноўныя законы, указы i пастановы вышэйшых органаў улады, якiя датычылiся пытанняў арганiзацыi выдавецкай дзейнасцi i функцыянавання СМI. Устаноўлена, што Украiна стала першай дзяржавай сярод усходнеславянскiх, дзе ў гэты час была прынята мэтанакiраваная Праграма развiцця нацыянальнага кнiгавыдання i прэсы на перыяд да 2000 г.

This article is devoted to analysis of the legal basis of Ukraine in the publishing field of the first years of state independence, when the system of national oriented book publishing and book dissemination was forming. Fundamental laws, decrees and enactments of superior government bodies about organization of publishing activity and functioning of mass media are produced there in chronological order. The fact, that Ukraine became the first East Slavic state, where the deliberate Program of the development of national publishing and mass media until 2000, was established.

**Уводзiны.** Час з 1991 па 1995 г. нашы даследчыкi назвалi перыядам дэцэнтралiзацыi ў кнiжнай галiне ўсходнеславянскiх краiн. Ён характарызаваўся частковай адменай абавязковага тэматычнага планавання, з’яўленнем першых недзяржаўных выдавецтваў, прыходам у выдавецкую дзейнасць «дылетантаў» [1, с. 57], развiццём рыначных адносiнаў у выдавецка-палiграфiчным комплексе [2]. У гэты перыяд завяршыўся распад адзiнай сiстэмы бiблiятэчнай, выдавецкай справы i кнiгазабеспячэння, у кожнай з краiн пачалося стварэнне самастойных iнфармацыйных сiстэм [3].

Украiна належыць да дзяржаў, дзе выдавецкая справа дасягнула значных поспехаў. Таму вывучэнне вопыту стварэння заканадаўчай базы як важнага складнiку развiцця галiны з’яўляецца актуальнай задачай для тэорыi i практыкi друкарскiх працэсаў на постсавецкай прасторы. Веданне спецыфiкi станаўлення кнiгавыдання на Украiне пасля абвяшчэння незалежнасцi былых рэспублiк СССР дазволiць глыбей пазнаць шляхi iнтэграцыi Беларусi з паўднёвай суседкай i ўбачыць перспектывы развiцця айчыннага кнiгавыдання.

Задача артыкула — устанавiць храналогiю стварэння заканадаўчай базы Украiны на працягу 1991–1995 гг. i ахарактарызаваць асноўныя заканадаўчыя акты.

Матэрыялам даследавання паслужылi законы, указы i пастановы Украiны [4], у якiх закранаюцца пытаннi кнiгавыдання i кнiгараспаўсюджвання.

**Асноўная частка.** Як вядома, 16 лiпеня 1990 г. Вярхоўная Рада УССР прыняла Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнiтэце, а 24 жнiўня 1991 г. быў прыняты Акт абвяшчэння незалежнасцi Украiны, якi 1 снежня 1991 г. пацвердзiў народ на ўсеўкраiнскiм рэферэндуме [5]. У тым жа месяцы Белавежская дамова скасавала iснаванне СССР.

У 1991–1995 гг. актуальнымi для ўкраiнскай выдавецкай галiны пытаннямi сталi: стварэнне нацыянальнай заканадаўчай, нарматыўна-тэхнiчнай базы, удасканаленне механiзму абмену друкаванымi выданнямi з замежнымi краiнамi, пашырэнне ўдзелу айчыннага кнiгавыдання i друку ў мiжнародным супрацоўнiцтве [6]. За гэты час на Украiне было прынята 70 актаў, што маюць дачыненне да кнiгавыдання, у той час як у Расii такiх дакументаў было створана 15, у Беларусi — 9 [7].

Украiнскiя заканадаўчыя акты **1991 г.** можна падзялiць на дзве групы: прынятыя да абвяшчэння незалежнасцi i пасля абвяшчэння незалежнасцi. Да першай групы адносяцца ўказы i пастановы, дзе акцэнтуецца ўвага на ўзнагародах лепшых працаўнiкоў палiграфiчных прадпрыемстваў, развiццi ўкраiнскай i iншых нацыянальных моў i культуры на тэрыторыi Украiны, статусе асобных цэнтральных газет. Вось гэтыя дакументы:

— указы Прэзідыума Вярхоўнай Рады УРСР: «Про відзначення працівників поліграфічних підприємств державними нагородами Української РСР» (29.01.1991), «Про присвоєння працівникам республіканських видавництв, м. Київ, почесного звання “Заслужений працівник культури Української РСР”» (18.02.1991);

— Пастанова Рады Міністраў УРСР № 41 ад 12.02.1991 «Про Державну програму розвитку української мови та інших національних мов в Українській РСР на період до 2000 року»;

— Пастанова Вярхоўнай Рады УССР ад 22.02.1991 «Про інформацію Комісії Верховної Ради Української РСР з питань культури та духовного відродження. Про стан роботи органів державного управління по створенню умов для розвитку культур національних меншин України»;

— пастанова № 844-XII ад 18.03.1991 «Про статут редакції газети Верховної Ради Української РСР “Голос України”».

Пасля абвяшчэння незалежнасці асобая ўвага была звернута на стварэнне новай сістэмы рэгулявання выдавецкай галіны, выданне асобных кніг, развіццё нацыянальных культур. У гэты час з'явіліся наступныя дакументы:

— Пастанова Вярхоўнай Рады Украіны ад 09.10.1991 «Про позицію преси, телебачення і радіо України під час державного перевороту та заходи, що випливають з цього»;

— распараджэнне Старшыні Вярхоўнай Рады Украіны ад 10.10.1991 «Про передачу власності, що належала ЦК Компартії України та КПРС»;

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 16.10.1991 «Про додаткові заходи щодо забезпечення видання Книги Пам'яті» («з мэтай актывізацыі працы па ўвекавечанні памяці савецкіх грамадзян, якія загінулі пры абароне Радзімы ў перадваенныя гады і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, а таксама пры выкананні інтэрнацыянальнага абавязку»);

— дэкларацыя Вярхоўнай Рады Украіны ад 01.11.1991 «Декларація прав національностей України» (у ёй усім нацыянальнасцям гарантавалася права стварэння сваіх культурных цэнтраў, нацыянальных газет, часопісаў, выдавецтваў);

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 27.11.1991 «Про передачу колишніх партійних видавництв у відання Державного комітету України по пресі».

У **1992 г.** працягнулася фарміраванне органаў кіравання выдавецкай галіной, эканамічнае рэгуляванне сферы, з'явіліся першыя спецыяльныя заканадаўчыя акты, а таксама раней, чым у Расіі і Беларусі звернута ўвага на пытанні правапісу, выданне асобных кніг і развіццё міжнародных адносінаў у выдавецкай галіне. За гэты час былі прыняты наступныя дакументы:

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 03.01.1992 «Про затвердження Положення про Головне управління по охороні державних таємниць у пресі та інших засобах масової інформації при Кабінеті Міністрів України»;

— Закон Вярхоўнай Рады Украіны ад 05.02.1992 «Про Єдиний митний тариф»;

— Указ Прэзідэнта Украіны ад 06.02.1992 «Про невідкладні заходи щодо соціального захисту діячів літератури і мистецтва в умовах переходу до ринкових відносин»;

— пастановы Кабінета Міністраў Украіны ад 03.03.1992 і 25.05.1992 «Про розміри відрахувань до фондів творчих спілок України за використання творів літератури та мистецтва» і «Про авторську винагороду за видання, публічне виконання та інші види використання творів науки, літератури і мистецтва»;

— пастановы Кабінета Міністраў Украіны ад 14.03.1992, 11.09.1992 і 16.09.1992 «Про додаткові заходи щодо забезпечення видання томів Зводу пам'яток історії та культури України», «Про підготовку і випуск серії книг “Реабілітовані історією”» і «Про заходи щодо видання Книги Пам'яті України»;

— загад № 1-45-40/24 ад 19.03.1992 «Питання оформлення друкованих видань»;

— Пастанова Прэзідыума Вярхоўнай Рады Украіны ад 30.04.1992 «Про статут редакції журналу Верховної Ради України “Віче”»;

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 08.06.1992 «Питання українського правопису», згодна з якой новая рэдакцыя правапісу ўводзілася ва ўсе сферы дзейнасці, у тым ліку ў выдавецкую справу;

— пастановы Кабінета Міністраў ад 6.07.1992, 01.08.1992 і 15.08.1992 «Про впорядкування розсилки контрольних примірників творів друку», «Питання Державного комітету України по пресі» (Зацверджанне Палажэння аб Дзяржаўным камітэце Украіны па прэсе);

— пастанова Кабінета Міністраў ад 15.08.1992 «Про спеціалізовані редакції для випуску літератури мовами національних меншин України»;

— загад Міністэрства статыстыкі Украіны ад 11.09.1992 «Про затвердження форми державної статистичної звітності для видавництв і видавничих організацій»;

— дамова аб супрацоўніцтве паміж Украінай і Французскай Рэспублікай (дамова ратыфікаваная Пастановай ВР ад 17.09.1992);

— закон Украіны «Про інформацію» (уводзіцца ў дзеянне Пастановай Вярхоўнай Рады ад 02.10.1992);

— распараджэнне Кабінета Міністраў Украіны ад 20.10.1992 «Про створення сектору видавництв, поліграфії, засобів масової інформації та видання Книги Пам'яті України»;

— пастанова Кабінета Міністраў ад 10.11.1992 «Про зміни в системі органів державної виконавчої влади, підвідомчих Кабінету Міністрів України»;

— закон Украіны «Про друковані засоби масової інформації (пресу) в Україні» (уводзіцца ў дзеянне Пастановай ВР ад 16.11.1992).

У **1993 г.** актыўна праходзіла эканамічнае станаўленне выдавецкай галіны, фарміраванне органаў кіравання, развіццё міжнародных адносінаў у паліграфічнай сферы. Шмат увагі надзялялася рэгістрацыі друкаваных сродкаў масавай інфармацыі, ахове дзяржаўных таямніц у СМІ, развіццю асветы. У гэтым годзе былі прынятыя:

— пастановы Прэзідыума Вярхоўнай Рады Украіны ад 05.01.1993 і 20.12.1993 «Про матеріально-технічне забезпечення роботи журналу "Віче" в 1993 році» і «Про матеріально-технічне забезпечення роботи газети "Голос України" в 1994 році»;

— пагадненне паміж Урадам Украіны і Урадам ФРГ пра культурнае супрацоўніцтва ад 15.02.1993;

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 15.03.1993 «Про державну підтримку творчих спілок, преси та книговидавничої справи»;

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 19.05.1993 аб утварэнні Дзяржаўнага камітэта Украіны ў справах выдавецтваў, паліграфіі і кнігараспаўсюджвання;

— пастановы Кабінета Міністраў Украіны ад 28.05.1993 і 05.07.1993 «Про деякі питання охорони державних теємниць у пресі та інших засобах масової інформації» і «Про затвердження Положення про Державний комітет України по охороні державних таємниць у пресі та інших засобах масової інформації»;

— пастановы Кабінета Міністраў «Про призначення Дяченка Ю. П. головою Державного комітету України у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження» ад 22.06.1993 і «Про заступників голови Державного комітету у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження» ад 18.09.1993;

— распараджэнне Прэзідэнта Украіны ад 30.07.1993 «Про заходи щодо державної підтримки преси»;

— пастанова Кабінета Міністраў ад 10.08.1993 «Питання державної реєстрації друкованих засобів масової інформації»;

— загад Міністэрства інфармацыі Украіны ад 16.08.1993 «Про державну реєстрацію друкованих засобів масової інформації»;

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 03.11.1993 «Про Державну національну програму "Освіта" ("Україна XXI століття")»;

— «Декларація про принципи відносин дружби і співробітництва між Україною і Туніською Республікою» ад 07.12.1993;

— закон Вярхоўнай Рады Украіны ад 23.12.1993 «Про авторське право і суміжні права» (другі пасля Расіі закон такога кшталту [7]).

У **1994 г.** працягнулася фарміраванне органаў кіравання выдавецкай галіной, развіццё міжнароднага супрацоўніцтва, вырашэнне пытанняў адносна аховы дзяржаўных таямніц у СМІ. Шмат увагі адводзілася пытанням дзяржаўнай падтрымкі СМІ. За гэты перыяд былі прыняты наступныя дакументы:

— пастанова ад 28.01.1994 № 40 «Про призначення Клименка А. П. заступником голови Державного Комітету України у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження»;

— «Угода між Міністерством зв'язку України і Міністерством зв'язку і інформатики Республіки Бєларусь про співробітництво з питань розповсюдження періодичних видань» ад 02.02.1994;

— «Чорноморська конвенція про співробітництво у галузі культури, освіти, науки та інформації» (дата ратыфікацыі: 04.02.1994, дата ўступлення ў сілу для Украіны: 30.10.1994);

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 29.03.1994 «Про членів колегії Державного комітету у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження»;

— Указ Прэзідэнта Украіны ад 14.04.1994 «Про присвоєння рангів державних службовців»;

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 29.04.1994 «Про затвердження Положення про порядок і механізм формування та опублікування Зводу відомостей, що становлять державну таємницю»;

— пастанова Кабінета Міністраў Украіны ад 15.06.1994 № 402, прысвечаная пытанням выдання «Украінскага правапісу» ў новай рэдакцыі;

— «Угода про Програму співробітництва між Урядом України і Урядом Держави Ізраїль у галузі культури і освіти на 1994–1996 роки» ад 16.06.1994;

— «Угода між Урядом України і Урядом Республіки Куба про співробітництво в галузях культури, освіти і науки» ад 27.06.1994;

— указы Прзідэнта Украіны ад 07.09.1994 і 18.11.1994 «Про заходи щодо впорядкування цін на окремі періодичні видання» і «Про додаткові заходи щодо державної підтримки періодичних видань»;

— Указ Прэзідэнта Украіны аб утварэнні Міністэрства Украіны ў справах прэсы і інфармацыі ад 18.11.1994;

— пастанова Кабінета Міністраў ад 01.12.1994 «Питання Міністерства у справах преси та інформації»;

— пастановы Кабінета Міністраў Украіны ад 12.08.1994 і 20.12.1994 «Про увільнення Табачника Д. В. від обов'язків першого заступни-

ка голови Державного комітету у справах видавництв, поліграфії та книгорозповсюдження», «Про присвоєння Клименку А. П. третього рангу державного службовця» і «Про присвоєння Таранику В. П. четвертого рангу державного службовця».

Напачатку **1995 г.** канчаткова сфарміравалася Міністэрства Украіны ў справах прэсы і інфармацыі. Паспяхова развівалася міжнароднае супрацоўніцтва, значна палепшыўся эканамічны стан выдавецкай галіны. Напрыканцы першай пяцігодкі незалежнасці ўкраінскія заканатворцы падводзілі вынікі і распрацоўвалі шляхі далейшага развіцця кніжнай сферы. Была створана адмысловая Праграмма развіцця нацыянальнага кнігавыдання і прэсы на перыяд да 2000 г. (першая на постсавецкай прасторы). Таксама ў гэтым годзе з'явіліся наступныя заканадаўчыя акты:

— Указ Прэзідэнта Украіны ад 02.01.1995 «Про положення про Міністерство України у справах преси та інформації»;

— «Угода про співробітництво в галузі книговидання, книгорозповсюдження і поліграфії (укр./рос.)» (дата падпісання: 10.02.1995, дата ўступлення ў сілу для Украіны: 22.03.1996);

— Пастанова Вярхоўнай Рады Украіны ад 17.02.1995 «Про рекомендації учасників парламентських слухань про стан освіти в Україні»;

— Закон Украіны «Про інформаційні агентства» (уведзены ў дзеянне Пастановай ВР ад 28.02.1995);

— Указ Прэзідэнта Украіны ад 28.02.1995 «Про Державну програму розвитку національного книговидання і преси на період до 2000 року»;

— раз'ясненне Галоўнай дзяржаўнай падатковай інспекцыі Украіны ад 01.04.1995 «Щодо сплати або звільнення періодичних видань від податку на добавлену вартість»;

— «Програма реалізації Попередньої угоди між Урядом України і Урядом Республіки Польща в галузі культурного та наукового співробітництва на 1995–1996 роки» ад 28.04.1995;

— ліст ад 30.05.1995 Дзяржаўнага мытнага камітэта Украіны «Щодо митного оформлення газет Російської Федерації, надрукованих на давальницькому папері іноземного замовника, за умови їх реалізації на території України»;

— «Угода між Урядом України і Урядом Російської Федерації про співробітництво в галузі культури, науки і освіти» ад 26.07.1995;

— «Угода про співпрацю між Міністерством освіти України і Міністерством національної освіти Республіки Польща на 1996–1998 роки» ад 14.09.1995;

— «Угода про культурне, науково-технічне співробітництво між Урядом України та Урядом Французької Республіки» (дата падпісання: 19.10.1995; дата ўступлення ў сілу для Украіны: 10.04.1996).

**Заключэнне.** На Украіне ў перыяд з 1991 па 1995 г. адбылося рэальнае станаўленне нарматыўна-прававой базы, якая ў цэлым забяспечыла належнае функцыянаванне і паступовае развіццё выдавецкай справы з улікам новых сацыяльна-эканамічных і палітычных умоў. Пра гэта сведчыць лагічнасць тэматычнага дыяпазону заканадаўчых актаў, што кожны год прымаліся заканатворцамі, а таксама выразная тэндэнцыя да паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння нацыянальнага кнігадрукавання, пастаянная ўвага да праблем культуры, мовы, літаратуры, тыражаваннем якіх і займаецца выдавецкая галіна.

Нягледзячы на палітычныя рознагалоссі, украінскія заканатворцы ажыццявілі ў гэты перыяд галоўнае: прынялі ў 1995 г. Дзяржаўную праграму развіцця нацыянальнага кнігавыдання і прэсы да 2000 г.

## Літаратура

1. Касько У. Беларуская кніга ў міжнародным інтэр'еры // Журналістыка-2011: стан, праблемы і перспектывы: матэрыялы 13-й Міжнар. навук.-практ. канф., прысвеч. 90-годдзю БДУ, Мінск, 8–9 снеж., 2011 г. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Вып. 13. Мінск, 2011. С. 56–58.

2. Ничипорович С. А. Развитие издательско-полиграфического комплекса Беларуси в условиях становления рыночных отношений. Минск: Харвест, 2001. 176 с.

3. Зайцев В. Н. Российские библиотеки в период перехода от СССР к России [Электронный ресурс]. URL: http://www.gpntb.ru/win/interevents/ crimea98/doc1/doc9.html (дата обращения: 19.03.2014).

4. Прафесійная юрыдычная сістэма Мега-НАУ [Электронны рэсурс]. URL: http://zakon.nau.ua (дата звароту: 17.03.2014).

5. День независимости Украины // Википедия [Электронный ресурс]. URL: http://ru.wikipedia.org/wiki/День_независимости_Украины (дата обращения: 17.03.2014).

6. Державна програма розвитку національного книговидання і преси на період до 2000 року [Электронны рэсурс] // Прафесійная юрыдычная сістэма Мега-НАУ. URL: http://zakon.nau.ua/doc/?doc_id=461517 (дата звароту: 19.03.2014).

7. Кулiковіч У., Тарасевіч К. Станаўленне нарматыўна-прававой базы беларускага і расійскага кнігавыдання (1991–1995) // Международная журналистика–2014: диалог культур и взаимодействие медиа разных стран: материалы III Междунар. науч.-практ. конф., Минск, 20 февр. 2014 г. / Белорус. гос. ун-т; под общ. ред. Т. Н. Дасаевой; сост. Б. Л. Залесский. Минск, 2014. С. 155–163.

*Паступіў 20.03.2014*